УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ БЕЖАНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ РАСІІ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1915 – ЛЮТЫ 1917 ГГ.)

***М.В.ЦУБА***

*Палескі дзяржаўны універсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

## УВОДЗІНЫ

Першая сусветная вайна была часам грандыёзных перамен у гісторыі ўсяго чалавецтва. Уцягнутыя ў гэту вайну розныя народы з'яўляліся своеасаблівым дэтанатарам сацыяльных выбухаў і нацыянальных узрушэнняў. Разам з гэтым мяняліся падыходы і накірункі дзейнасці нацыянальных рухаў, у тым ліку і беларускага, які імкнуўся прыстасавацца да умоў вайны, згуртавацца на неабсяжных абшарах Расійскай імперыі, куды закінула бежанцаў з Беларусі вайна, выжыць і праводзіць далей мэтанакіраваную працу.

Такім чынам, дзейнасць беларускага нацыянальнага руху ў вызначаны перыяд мела пашырэнне ў бежанскіх масах, асноўная частка якіх асела ў цэнтральных губернях Расіі і ў Паволжы. У сярэдзіне 1915г. пры камітэце вялікай княжны Таццяны Мікалаеўны быў створаны асобны аддзел па рэгістрацыі бежанцаў і аказанай дапамогі пацярпелым ад ваенных бедстваў [1,арк.22]. Па звестках гэтага аддзела толькі ў Тамбоўскай і Самарскай губернях на 1 студзеня 1917г. знаходзілася 126.916 бежанцаў з Беларусі [2,с.2]. Наогул жа на 1 лютага 1917 г. колькасць бежанцаў з пяці заходніх губерняў на тэрыторыі Расіі ўзрасла да 1.130.042 чалавек, у тым ліку з Гродзенскай губерні – 750 680, Віленскай – 164 351, Мінскай – 161 453, Віцебскай – 51 594, Магілёўскай – 1 964 [3,с.57]. "Параскіданыя праз вайну па ўсім абшары былой Расеі беларусы з кожным днём усе галасней і ясней давалі аб сабе знаць" [4,с.5], – адзначаў тады вядомы беларускі дзеяч Язэп Варонка.

## ВЫНІКІ І ІХ АБМЕРКАВАННЕ

Пачынаючы з другой паловы 1915г., галоўнымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху становяцца Петраград, Масква, Калуга, Арол, Волагда, Тула, Яраслаўль, Саратаў, Тамбоў, Казань, Самара, Кіеў, Адэса і іншыя гарады. Створаныя тут бежанскія камітэты сталі апорнымі пунктамі збору беларускіх дзеячаў. «Побач з камітэтамі ведамаснымі, царскі ўрад даў некатарую мажлівасць да існавання і нацыянальных камітэтаў... Вакол гэтых камітэтаў, разам з бежанскаю справай, пачала вясціся культурна-нацыянальная праца, якая выяўлялася ў сходах, наладжванні спектакляў, літаратурных вечарын і ў выданні газет» [5,с.184], а таксама вялася пэўная праца па наладжванню сувязей паміж самімі камітэтамі і асобнымі беларускімі дзеячамі, раскіданымі вайной па ўсёй Расійскай імперыі.

Акрамя адкрытай культурна-асветніцкай работы пры бежанскіх камітэтах адбываліся штотыднёвыя сходы (па нядзелях), дзе збіралася шмат самай рознай беларускай публікі (беларускія грамадскія дзеячы, студэнты, святары, рабочыя і інш.), на іх абмяркоўвалася становішча на Беларусі, і ўздымалася пытанне наконт тактыкі беларусаў пры тых ці іншых варунках вайны. «Трэба засведчыць, – успаміналі дзеячы Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, якія падтрымлівалі сувязі з падобнымі таварыствамі ў іншых гарадах, - што ў адносінах да вайны праз увесь час беларусы трымаліся «паражэнчага» пункту гледжання, бачачы ў паражэнні Расіі выйсце да нацыянальнага вызвалення Беларусі» [5,с.184].

Наогул Петраградскае таварыства з'ўлялася ўзорам для іншых дабрачынных арганізацый як па налажванні культурна-нацыянальнай працы, так і па падтрымцы і рабоце з бежанцамі. І гэта не дзіўна, бо заснавальнікамі і кіраўнікамі дадзенай арганізацыі працавалі Б.І.Эпімах-Шыпіла, З.Х.Жылуновіч, Б.А.Тарашкевіч, Л.С.Сяўрук, М.І.Мігай, Э.А.Будзька, А.П.Ярэміч, Ч.І.Родзевіч, У.Ф.Міткевіч, Я.В.Кавецкая і іншыя [6,с.361]. Таварыства аказвала дапамогу грашыма і рэчамі, адкрыла інтэрнаты для беларускіх студэнтаў і вучняў, дзіцячы прытулак, кравецкую майстэрню, выдавала лістоўкі з заклікам ахвяраваць грошы для беларускіх бежанцаў, якіх дарэчы налічвалася ў Петраградзе ў канцы 1916г. 100 704 чалавекі [7,арк.157]. Пратэндуючы на лідэрства ў беларускім нацыянальным руху ў гэты час і спрабуючы кансалідаваць разрозненыя беларускія арганізацыі,

ПолесГУ

Петраградскае таварыства наладзіла цесныя сувязі з Мінскім аддзелам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны і імкнулася пашырыць свой уплыў на ўсю тэрыторыю, дзе знаходзіліся беларускія бежанцы [6,с.361]. Адзін з найбольш актыўных удзельнікаў Петраградскага таварыства, З. Жылуновіч, так ахарактарызаваў дзейнасць гэтай арганізацыі: «Тут праходзілі зборкі беларускіх дзеячаў, студэнтаў-беларусаў і некаторых рабочых, на якіх абгаварваліся беларускія справы. У таварыстве арганізоўваліся беларускія пастаноўкі (п'есы), а таксама дыскутаваліся палітычныя пытанні» (8, с. 98).

Такім чынам, беларускія нацыянальныя сілы, закінутыя вайной у сталіцу імперыі, не пакідалі працаваць дзеля сваёй Бацькаўшчыны і свайго народу. Неабходна адзначыць, што нацыянальная свядомасць ахапіла ўсе слаі беларускага грамадства. З гэтай нагоды хацелася б адзначыць удзел у беларускім руху духавенства. Ёсць факты, што акрамя дзейнасці дабрачыннага Петраградскага таварыства ў 1916г. у Петраградзе беларускай інтэлігенцыяй з ліку выкладчыкаў і слухачоў сталічнай духоўнай акадэміі быў заснаваны гурток вядомай на Беларусі арганізацыі «Хрысціянская злучнасць» [9,с.78].

Беларуская нацыянальная праца набывала ўсё большы размах і ў Маскве. Ажывілася і праваслаўнае духавенства, што прыняло шэраг рэзалюцый у беларускім нацыянальным духу, цэнтрам якога ў ваенны час аказалася Масква, паколькі тут аселі амаль усе прыехаўшыя з Гродзеншчыны і Віленшчыны праваслаўныя святары. У цэлым жа Масква праняла найбольшую колькасць беларускіх бежанцаў сярод усіх расійскіх гарадоў: тут іх налічвалася 128 261 чалавек [10,арк.157]. А Маскоўскае таварыства бежанцаў-беларусаў цесна кантактавала з іншымі бежанскімі арганізацыямі ў Кіеве, Адэсе, Калузе, Вятцы, Саратаве, Тамбове і г.д. Разам з тым лідэры Маскоўскага таварыства бежанцаў-беларусаў: А.Бурбіс, Ф.Турук, Я.Дыла, А.Цвікевіч наладзілі сувязі не толькі са многімі беларускімі арганізацыямі ў іншых гарадах, але і з «асобнымі актыўнымі ўдзельнікамі беларускага руху, абмяркаваўшы з імі планы будучай працы» [11,с.44].

Пэўная работа ў беларускім нацыянальным духу сярод бежанцаў-беларусаў праводзілася і ў Яраслаўлі. Асяродкам беларушчыны тут з'яўляўся адчынены ў час вайны Мінскі настаўніцкі інстытут, у якім выкладаў Усевалад Ігнатоускі. У інстытуце быў уведзены курс беларусазнаўства, у сувязі з якім «выхаванцы пазналі жывую цікавасць да вывучэння роднага беларускага краю». Але гэтая цікавасць не магла быць задаволена з-за крайняй беднасці матэрыялаў у бібліятэцы інстытута. Таму педсавет звярнуўся да выкладчыка гісторыі У.Ігнатоўскага з просьбай у час паездкі ў Маскву набыць неабходныя кнігі і літаратуру па вывучэнню Беларусі. Вялікую і станоўчую ролю ў ажыццяўленні ідэі беларусізацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе адыграў дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута Д.А.Сцяпура. Менавіта ў будынку гэтага інстытута з 1916г. размяшчалася Яраслаўска-Беларуская рада, якую даволі часта наведваў паэт Максім Багдановіч [12,с.1]. Пашыралася нацыянальна-культурная праца сярод беларускіх бежанцаў у Казані. Большасць з якіх складалі навучэнцы Віленскай сярэдняй тэхнічнай школы, эвакуіраваныя сюды напрыканцы 1915 года. У хуткім часе да суполкі віленскіх навучэнцаў прымкнулі салдаты-беларусы з запасных палкоў у Казані, сярод якіх быў сваяк вядомага беларускага дзеяча Адама Станкевіча – Янка Станкевіч. З ініцыятывы Янкі Станкевіча тут быў створаны гурток беларускай моладзі «Пралеска", які ў гэтым горадзе шматразова ставіў канцэрты і ладзіў тэатральна-мастацкія вечарыны для бежанцаў і салдат з Беларусі.

Акрамя таго, быў створаны Арэнбургскі гурток беларусаў, Беларуска-украінскі камітэт дапамогі ахвярам вайны ў Барнауле, Беларуская вучнёўская грамада і «Беларуская хатка» у Арле, Беларускі нацыянальны гурток у Багародзіцку (Тульская губерня), гурток беларускай сацыялістычнай моладзі ў Калузе і іншыя.

Такім чынам, згодна з паведамленнем газеты «Гоман», якая уважліва сачыла за грамадска-палітычнымі падзеямі на другой палове фронту, «беларускія дзеячы, што знаходзіліся сярод бежанскіх мас «не спалі у шапку» гэтыя два гады (вайны), а кідалі ў народ шчодрай рукой зярняты нацыянальнай свядомасці, якія павінны ўзысці і даць багаты ўраджай» [13,с.3-4].

Аднак, каб выпрацаваць адзіную тактыку руху ў склаўшымся становішчы, а таксама падтрымліваць пастаянныя сувязі з раскіданымі па ўсёй Расійскай імперыі бежанцамі-беларусамі з мэтай прыцягнення і далучэння іх да нацыянальна-культурнай працы, такіх намаганняў было недастаткова. У дадзенных абставінах для вырашэння наспелых задач неабходна было заснаваць выданне газет. Некаторы час перашкодай на гэтым шляху была адсутнасць грошай. Але, калі быў атрыманы дазвол Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі на выданне дзвюх газет – «Дзянніца» і «Светач» («Svetac»), а таксама былі знойдзены друкарня і папера, то матэрыяльны бок пытання быў хутка вырашаны дзякуючы агульным намаганням членаў Беларускага таварыства ў

Полесгу

Петраградзе па аказанню дапамогі пацярпелым ад вайны, пад крылом якога і размясціліся выдавецтвы газет. Тады па-сапраўднаму пачалася падрыхтоўчая выдавецкая дзейнасць. Рэдактар-выдавец «Дзянніцы», Цішка Гартны (З.Жылуновіч), так успамінае пра гэта: «На першы нумар парашылі даць перадавую аб долі Беларусі ў звязцы з сусветнай вайною, артыкул аб балючым у той час харчовым пытанні, трохі мастацкіх твораў, хроніку важнейшых выданняў і некалькі карэспандэнцый» [14,с.П2]. Але выданне газет затрымалася з-за недахопу ў цэнзурным камітэце цэнзара, які б валодаў беларускай мовай. У выніку першыя нумары абедзвюх газет выйшлі толькі 1 лістапада 1916 года. Прычым у газеце «Дзянніца» поўнасцю захаваліся толькі два артыкулы: Акцюбы (Э.Будзька) «Думкі да граматыкі» і Зміцера Капыляніна (Ц.Гартны) «Аб беларускім універсітэце». У апошнім аўтар падводзіць рысу пад працяглымі спрэчкамі наконт адкрыцця на Беларусі ўніверсітэта: «Беларусі патрэбны ўніверсітэт – усяроўна, дзе б яго не залажылі: у Мінску, Віцебску або Магілёве. Ён усяроўна павінен быць для беларусаў і звацца Беларускім. Дык па-нашаму, не трэба траціць слоў на спрэчку, а трэба ўсе старанні злучыць у адно, каб хутчэй дастукацца светача краіны» [15,с.2]. Тым не менш, нягледзячы на белыя цэнзурныя плямы, газета «Дзянніца» усё ж выйшла ў свет. Яе атрымалі многія бежанцы-беларусы ў розных кутках расійскай дзяржавы, дайшла яна і да чытачоў прыфрантавога Мінска.

У наступным нумары больш выразна вызначаецца твар газеты, намячаюцца пастаянныя раздзелы: перадавая, мастацкія творы, артыкулы на актуальныя тэмы, падборкі матэрыялаў «З вайны», «З Літвы», аб'явы, карэспандэнцыі. У перадавым артыкуле «Дзянніцы» гаварылася: «Газета і кніжка на роднай мове ясней усяго іншага могуць сведчыць аб культурным росце народа... Цяпер мы яскрава бачым, што яму нельга абысціся без свае газеты, без друкаванага слова. Само жыццё вымушае к гэтаму» [16,с.1]. «Дзянніца» знаходзілася ў курсе тых падзей, якія адбываліся не толькі ў Петраградзе, але і ў Маскве, Мінску, іншых гарадах. Напрыклад, у артыкуле «З нашага жыцця» расказваецца аб дабрачыннай працы Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» і аб культурна-нацыянальнай рабоце «Беларускай хаткі». Дадзены артыкул заканчваецца заклікам: «Клічма ўсіх свядомых беларусаў яднацца і працаваць, не пакладаючы рук, каб у гэтыя суровыя і важныя часы, калі быць можа вырашаецца ўвесь далейшы кірунак жыцця нашага Краю, каб быў чутны і наш голас – голас Маладой Беларусі» [17,с.2]. У газеце таксама асуджалася палітыка нямецкіх акупацыйных улад, закраналіся сацыяльныя праблемы, пытанні развіцця беларускай нацыянальнай культуры, вылучалася ідэя даць магчымасць самавызначэнню малых народаў. Менавіта апошняя тэма найбольш ярка выражана ў развітальным нумары «Дзянніцы». Гаворачы аб пасляваенным лёсе малых народаў і іх праве на самастойнае дзяржаўнае будаўніцтва, аўтар падводзіць да таго, што «не можа панаваць на зямлі між усімі людзьмі згода і шчасце», пакуль усе народы свету не атрымаюць свабоду на самым шырокім фундаменце» [18,с.1]. Працяг дадзенай тэматыкі праглядваецца і ў артыкуле «Паланізацыя краю», дзе расказваецца аб праяўленні вялікай актыўнасці з боку польскіх грамадска-палітычных колаў па захопу ў свае рукі некаторых правоў на ўладу і ўплыве на мясцовае беларускае насельніцтва на акупіраванай немцамі тэрыторыі, а таксама адстойваецца права беларускага народа на сваё нацыянальнае развіццё. У заключнай частцы артыкула аўтар заклікае беларускую інтэлігенцыю да аддання ўсіх сваіх сіл, ведаў і энергіі «на карысць свайго Краю і народу» [19,с.2].

З мэтай правядзення грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы сярод бежанцаў-беларусаў і падрыхтоўкі кадраў для нацыянальнай работы на Беларусі на старонках «Дзянніцы» пераважна друкаваліся публіцыстычныя артыкулы і творы З.Жылуновіча, Ф.Шантыра, К.Буйло, А.Паўловіча, Ф.Красоўскага, Х. Ларнышэвіча, Я.Канчара, Р.Зямкевіча і іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, якія стаялі на нацыянальна-дэмакратычных пазіцыях.

Аднак у хуткім часе супраць ажыўлення беларускага нацыянальнага руху выступілі рэакцыйныя сілы Расіі. У выніку па маўклівай згодзе дзяржаўных кіраўнікоў царскай улады пачалося сістэматычнае прад'яўленне прэтэнзій да газеты. Цэнзура здымала амаль усе матэрыялы, якія датычыліся становішча на Беларусі ў сувязі з сусветнай вайной, а таксама аб харчовых праблемах, важных здарэннях, карэспандэнцыі з месц і іншыя падрыхтаваныя публікацыі. Не дазвалялася друкаваць нават тое, што «хоць як закранала пытанне беларускага нацыянальнага руху, нават назву «Беларусь»... Усе перашкоды рэакцыйных сіл былі накіраваны на стварэнне невыносных умоў для існавання газеты. І пасля выхаду ў свет сёмага нумара (31 снежня 1916г.) выданне «Дзянніцы» было спынена» [11,с.44].

Прыкладна такі ж самы лёс напаткаў і другую штотыднёвую беларускую газету «Светач» (рэдактар-выдавец Эдуард Будзька), якая аб'ядноўвала вакол сябе некаторую частку беларускай інтэлігенцыі і каталіцкіх дзеячаў. Газета прапагандавала ідэі адзінства беларусаў незалежна ад іх

Полесгу

класавай прыналежнасці, заклікала ўсе грамадскія сілы да ажыццяўлення «беларускага нацыянальнага ідэалу [3,с.46]. Розніца паміж «Светачам» і «Дзянніцай» была не толькі ў разглядзе класавага пытання і алфавіце (лацінка і кірыліца), але яна істотна адчувалася ў падыходах і выяўленні тых ці іншых праблем, грамадска-палітычных поглядах, мэтах і шляхах іх дасягнення і г.д. З самага пачатку «Дзянніца» задумвалася як агульнабеларуская, грамадска-палітычная і літаратурная газета. У «Светачы» у першую чаргу уздымаліся пытанні развіцця беларускай вёскі, сялянскага побыту, значнае месца адводзілася рэлігійнай тэматыцы, таму яна адрасавалася ў асноуным вясковаму насельніцтву і ў першую чаргу – беларусам-католікам. У сваім рэдакцыйным звароце да чытачоў, «Светач» выступіў з паведамленнем наступнага зместу: «Бяромся да працы – бяромся выпускаць у свет беларускую газетку – з тымі думкамі, каб услужыцца родным людцам беларусам добрым словам, добрай радай, добрай праўдай» [20,с.1]. Далей у артыкуле «Светач для народа» растлумачваецца ў больш шырокім сэнсе прызначэнне газеты: «Светач павінен асвятляць дарогу да дабра – дабра матэрыяльнага і духоўнага. Дабро матэрыяльнае можна пасцігнуць, асвятляючы новы спосаб гаспадаркі, даючы пазнаць новы склад грамадзянскага жыцця ў супольнай працы на ўсіх дзялянках матэрыяльнага бытавання» [21, с.2]. Акрамя пералічанай вышэй тэматыкі, на старонках «Светача» з'яўляліся і навуковыя артыкулы, з якіх адным з найбольш значных з'яўляўся вялікі нарыс Акцюбы (Э.Будзькі) «Думка да граматыкі», які друкаваўся ва ўсіх 7 нумарах «Светача» і «Дзянніцы». У цэлым жа ўвесь час у цэнтры ўвагі газеты заставаўся сялянскі побыт і яго праблемы. Не выпадкова ў 5-ці нумарах змяшчаюцца артыкулы «Як лепей будавацца», а таксама парады агранома, як павесці гаспадарку на новы лад і г.д. Разам з тым прыкметна заўважаецца ўхіленне газеты ад вострых грамадска-сацыяльных і нацыянальных праблем. Пераважную большасць рэдакцыйнага ядра «Светача» складалі супрацоўнікі былой віленскай газеты «Беларус». Тут друкаваліся А.Зязюля, А.Паўловіч, Э.Будзька, І.Касцевіч, Ц.Краўчанка, Л.Малышэвіч і інш.

І ўсё ж выданне памяркоўнай «Дзянніцы» і яшчэ больш бяскрыўднага «Светача» выклікала вялікую хвалю абурэння з боку петраградскіх рэакцыйных газет. Чарнасоценцы ўсяляк травілі беларускія газеты і абвінавачвалі іх у служэнні Германіі. Напрыклад, вядомы дзеяч чарнасоценных арганізацый «Крестьянин», а затым «Белорусское общество», Лука Саланевіч, на старонках газеты «Новое время» называў з'яўленне «Дзянніцы» і «Светача» ні больш ні менш як «Нямецкімі хітрыкамі» і «мазепінствам» [22,с.2]. Так абедзве беларускія газеты, якія выходзілі на працягу двух месяцаў і пакінулі прыкметны след у гэты перыяд у першую чаргу сярод беларускіх бежанскіх мас, вымушаны былі спыніць свае выданні 31 снежня 1916 г., павіншаваўшы сваіх чытачоў з надыходам новага 1917 года.

## ВЫВАДЫ

Такім чынам, дадзеныя газеты не выканалі пастаўленыя перад імі задачы. Ва ўмовах вайны і існавання ваеннай цэнзуры, а таксама ў выніку паклёпніцкіх нападак з боку некаторых расійскіх шавіністычных выданняў, яны не змаглі ў належнай ступені разгарнуць дзейнасць па згуртаванню бежанцаў-беларусаў і прыцягенню іх да нацыянальна-культурнай справы і вымушаны былі спыніць сваё выданне.

Тым не менш, значная кагорта беларускіх нацыянальных дзеячаў, паўсюдна раскіданых вайной, нягледзячы на шматлікія неспрыяльныя акалічнасці, працягвала працаваць у нацыянальным накірунку. Такая праца вялася не толькі на неакупіранавай тэрыторыі Беларусі. Сапраўднымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху падчас вайны з'яўляліся Пецярбург і Масква. Жыла беларуская нацыянальная справа і ў Туле, якую тут узначальваў Аляксандр Цвікевіч, і ў Арле, дзе беларуская праца праводзілася пад кіраўніцтвам Вацлава Іваноўскага і Лявона Дубяйкаўскага, і нават у Сібіры, дзе знаходзіліся і адкуль пісалі свае творы Алесь Гарун і Язэп Лёсік.

## ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ – Ф. 295. – Воп. 1. – С. 8983.
2. Известия Комитета Её Императорского Высочества Великой княжны Татьяны Николаевны. Петроград: 1917. – 1 января.
3. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917-1925) /Н.С. Сташкевич – Минск: Университетское, 1985. – 304 с.
4. Воронко, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году. Кароткі агляд./Я. Воронко – Коўна: Др. А.Бака і Х.Манкес, 1920. – 32.с
5. Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мінск: Выд-ва ЦВК БССР, 1924. – 323 с.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6т. – Мінск: Бел.Эн., 1993, т.1./ Рэдкал.: Біч М.В., і інш. – 1993. – 494 с.

7. НАРБ – Ф. 62. – Воп. 1. – С. 197.
8. Весялкоўскі, Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс) /Ю. Весялкоўскі. – Беласток – Лёндан, 1996. - 361 с.
9. Палітычныя партыі Беларусі /Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. Серыя ”Гістарычныя сшыткі”. 2. - Мінск: Згода, 1994. – 262с.
10. НАРБ – Ф. 62. – Воп.1. – С. 197.
11. Игнатенко, И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Минск: Наука и техника, 1986. – 344 с.
12. Казак, А. Ярославль сохрант память о белорусах /А. Казак //Народная газета, 1995. – 26 мая.
13. Весткі з Расеі //Гоман. – 1916.–3 лістапада.
14. Жылуновіч, З. Эпізод з жыцця беларускай часопісі / З. Жылуновіч. // Полымя. – 1923. – № 7-8. – С. 11 – 115.
15. Капылянін, З. Аб беларускім універсітэце /З. Капылянін //Дзянніца. –1916. – 1 лістапада.
16. Капылянін, З. Аб развіцці беларускай нацыянальнай культуры / З. Капылянін //Дзянніца. – 1916. – 9 лістапада.
17. Асьмак, М. З нашага жыцця /М. Асьмак /Дзянніца. – 1916. – 27 лістапада.
18. Гартны, Ц. Перадавіца /Ц. Гартны //Дзянніца – 1916. – 31 снежня.
19. Паланізацыя краю //Дзянніца. – 1916.–31 снежня.
20. Да чытачоў//Светач. –1916. – 1 лістапада.
21. Будзька, Э. Светач для народа /Э. Будзька //Светач. – 1916. – 1 лістапада.
22. Солоневич, Л. Немецкие хитрости /Л. Солоневич //Новое время. – 1917. – 10 февраля

## THE ACTIVITIES OF BELARUSIAN REFUGEE ORGANIZATIONS ON THE TERRITORY OF RUSSIA DURING WORLD WAR I (AUGUST 1915 – FEBRUARY 1917)

***M.V. TSUBA***

***Summary***

Different aspects of social and cultural life of Belarusian refugee organizations, which happened to be on the territory of Russia, are investigated. Special attention is paid to the conditions and state, which existed during the war on the territory of the Russian Empire and influenced the work of Belarusian refugee organisations greatly.

*Паступіў у рэдакцыю 29 верасня 2009 г.*

Полесгу